# ЯК ТРАПІЦЬ У ШОРТ-ЛІСТ?

## Нацыянальная літаратурная прэмія пачынае адбор твораў

**Пачалі — і спадабалася. Летась упершыню назвалі лаўрэатаў першай Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Пісьменнікі ажывіліся: цяпер важнасць іх творчай справы падкрэслена асаблівай дзяржаўнай увагай. А праз яе — праз рэзананс — кнізе прасцей знайсці шлях да людзей.**

Прэмія — гэта перш за ўсё адзнака твора, хоць грашовую частку нiхто не адмяняе. Падтрымаць літаратара — гэта таксама крок да падтрымкі літаратуры, у якой адлюстроўваецца сучасны твар краіны. Пра гэта, у прыватнасці, гаварыў прафесар Іван Саверчанка на семінары ў Гродна, прысвечаным сучаснай літаратурнай крытыцы. Нацыянальная прэмія паказала, што ў Беларусі ёсць творцы, здольныя зазірнуць углыб чалавечай душы, якія хочуць зразумець, адкуль і чаму ў людзей, якія прадстаўляюць народ, складваецца пэўны тып мыслення, светаадчування. Як гэта здолеў зрабіць пісьменнік Уладзімір Саламаха, што атрымаў прэмію ў намінацыі «За лепшы твор прозы». Ёсць творы, у якіх аўтары шукаюць адказ на пытанне: чым асаблівы наш беларускі менталітэт?.. Гэта праца даследчыкаў, якія адлюстроўваюць час, і гэта першаснае. Але пісьменнік піша для таго, каб яго думкі знаходзілі водгук у іншых. Трэба толькі, каб кнігі знаходзілі чытача, каб у таго было разуменне, чаму трэба чытаць кнігі. У выніку правядзення першай Нацыянальнай прэміі стала нагодай задумацца і пра ролю літаратуры ў грамадстве.

Цяпер пойдзем далей: абвешчаны другі конкурс у рамках Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў 2016 годзе. Лёс прэміі, якая ўручаецца ў сямі намінацыях, вырашае сур'ёзнае журы. Але гэта ў фінальнай частцы. На першым этапе працуе экспертная камісія: разглядае прадстаўленыя творы, вызначае іх якасць, актуальнасць, навізну. І фарміруе шорт-ліст. Але бярэцца за ведама і запатрабаванасць твора (у кнігарнях, бібліятэках, тэатрах, калі гаворка пра драматургію).

Згодна з умовамі конкурсу, удзельнічаць у ім могуць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. Але вылучаць творы могуць і аўтарскія калектывы (у складзе не больш чатырох чалавек). Ацэньвацца будуць творы мастацкай літаратуры ў прозе, паэзіі і драматургіі, публіцыстыка, творы ў галіне літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства, якія выпусцілі ў свет выдавецкія арганізацыі Рэспублікі Беларусь у папярэдні год. Гэта могуць быць асобныя друкаваныя выданні ці на электронных носьбітах, ці апублікаваныя ў сродках масавай інфармацыі літаратурна-мастацкай накіраванасці. І як у наш час не ўлічваць уплыў глабальнай сеткі інтэрнэт, дзе таксама размяшчаюцца творы, чытаюцца і актыўна абмяркоўваюцца? Літаратурная прастора цяпер даволі шырокая.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца Міністэрствам інфармацыі (галоўны арганізатар ад імя дзяржавы) да 1 ліпеня. Прадстаўляць іх могуць асобныя аўтары, а таксама аўтарскія калектывы, творчыя саюзы, выдавецкія арганізацыі, установы адукацыі і навукі, якія маюць дачыненне да мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Адзін аўтар можа прымаць удзел не больш чым у адной намінацыі і з адным творам. А ўжо з 1 жніўня з усімі вылучанымі творамі павінна знаёміцца журы, каб вызначыць пераможцаў. Часу на ўсё няшмат, ужо 4 верасня ў Рагачове падчас адкрыцця Дня беларускага пісьменства будуць абвешчаныя вынікі конкурсу, названыя лепшыя творы і ўзнагароджаны іх аўтары.

Але сутнасць у тым, што лепшыя кнігі, якія адзначыць журы, ужо напісаны, выдадзены. Іх можна пачытаць. І нехта, напэўна, гэта ўжо зрабіў. Прэмія існуе для таго, каб, звярнуўшы ўвагу на лепшае, трымаць узровень літаратуры, які дазволіць ёй развівацца. Яна для тых, хто стварае без думак пра высокія адзнакі.

Дзяніс Марціновіч, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «За лепшы крытычны твор», аўтар кнігі «Жанчыны ў жыцці Уладзіміра Караткевіча» лічыць, што прэміі ёсць куды ўдасканальвацца:

— Прэмія дае невялікую суму грошай (пасля выплаты падаткаў я атрымаў каля 4,2 мільёна), згадзіцеся, гэта сума не можа кампенсаваць час, калі ты пісаў кнігу. Таксама яна дае шэраг згадак у СМІ, бо імёны пераможцаў надрукавалі шмат газет і выданняў. Ну і маральнае задавальненне. Прыемна, што тваю кнігу заўважылі і ацанілі...

Галоўнае ў любой прэміі — думкі пра ўдасканаленне. Каб сёлета гэта было больш прадстаўніча, чым летась. Каб і па колькасці твораў, і па іх якасці можна было гаварыць пра развіццё. З аднаго боку — літаратары, з другога — чытача. Чалавека. І наогул грамадства.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ На экране

# Слаўны валацуга Тора-сан

## КУЛЬТАВАЯ ЯПОНСКАЯ КАМЕДЫЯ Ў МІНСКУ

**Японскія кінакампаніі ў 1960-х гадах апынуліся ў складаным становішчы: вялікі экран, шырокі фармат, кінатэатры сталі прайграваць у папулярнасці тэлебачанню, доля замежнай кінапрадукцыі павялічылася, а цікавасць да кіно ўвогуле ўпала. Некаторыя кінакампаніі ў тыя часы абанкроціліся. Але не легендарная «Сёціку»: своечасова яна падхапіла ідэю тэлевізійнага камедыйнага серыяла «Мужчыну жывецца цяжка», дзякуючы якому, можна сказаць, выратавалася ад сыходу ў небыццё. У выніку за дваццаць шэсць гадоў кінакампанія стварыла 48 фільмаў з адным героем — Тора-санам, якога іграў акцёр Кіёсі Ацумі. Чатыры з гэтых сарака васьмі карцін будуць паказаны ў рэтраспектыве, якая пройдзе ў Мінску з 31 сакавіка да 3 красавіка.**



**Галоўны герой малаадукаваны, няхітры, што называецца, чалавек-катастрофа, які пастаянна трапляе ў розныя няёмкія сітуацыі альбо іх стварае. Але пры гэтым ён адкрыты, дабрадушны чалавек, які заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу.**

Серыял, які стаў натхненнем для кінакампаніі «Сёціку», выйшаў на тэлеэкраны Японіі ў 1968 годзе. Магчыма, ён так і застаўся б у гісторыі выключна тэлевізійным фільмам, калі б не адзін сюжэтны паварот: у заключным эпізодзе галоўны герой — персанаж, якога паспелі палюбіць гледачы, — узяў ды памёр. Гэта выклікала хвалю незадаволенасці, што і прыцягнула ўвагу «Сёціку».

Напэўна, не палюбіць яго было немагчыма. Персанаж Тора-сан нарадзіўся ў беднай сям'і ў квартале Сібамата — частцы Токіа, дзе селіцца просты працоўны люд. Сам герой малаадукаваны, няхітры — што называецца, чалавек-катастрофа, які пастаянна трапляе ў розныя няёмкія сітуацыі альбо іх стварае. Але пры гэтым ён адкрыты, дабрадушны чалавек, які заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. Тора-сан рана страціў бацькоў і з тых часоў вядзе вандроўны лад жыцця, але часам ён вяртаецца ў родныя мясціны, што становіцца сюжэтам для чарговай серыі.

На рэтраспектыве будзе паказаны ў тым ліку першы фільм серыі — «Мужчыну жывецца цяжка. Наш слаўны валацуга Тора-сан», дзе галоўны герой прыязджае дадому і сустракаецца з малодшай сястрой Сакурай, якая збіраецца выйсці замуж. Брат, не кантралюючы сябе, устройвае скандал, і вяселле адмяняецца. У карцінах «Тора-сан і каханне пад парасонам» і «Тора-сан, рэлігія, каханне» адлюстроўваецца пастаянны матыў серыі — каханне без узаемнасці. У першай карціне закаханы ў Тора-сана, у другой — наадварот. У серыі «Усход і барвовы захад Торадзіра» да нечаканых наступстваў прыводзіць знаёмства галоўнага героя са знакамітым мастаком і п'яніцам, якога той прымае за валацугу.

Адным са сцэнарыстаў тэлефільма быў Ёдзі Ямада, які стаў рэжысёрам усіх сарака васьмі фільмаў «Мужчыну жывецца цяжка». Ён паспяхова працуе да сённяшняга дня і з'яўляецца частым госцем Берлінскага кінафестывалю: некалькі разоў яго карціны намінаваліся на галоўную ўзнагароду, а ў 2010 годзе Ямада атрымаў Ганаровы прыз Berlinale Camera Award.

**Серыял «Мужчыне жывецца цяжка» трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса як самы працяглы ў гісторыі кіно — ён здымаўся з 1969 да 1995 года.**

Праект серыяла «Мужчыну жывецца цяжка» быў новым для японскага кіно, але не для сусветнага кінематографа. Галоўнага героя Тора-сана параўноўваюць з персанажам Шарло Чарльза Чапліна, але і ў таго былі папярэднікі. Фармат шматсерыйных камедый становішчаў быў створаны яшчэ піянерамі кінематографа ў Францыі. Макс Ліндар пераняў эстафету ў камічнага кінаакцёра Андрэ Дзіда, які з'ехаў працаваць у Італію і стварыў пастаянны кінаобраз — элегантнага француза ў касцюме-тройцы, легкадумнага і гультаяватага Макса, які то вучыцца катацца на каньках, то вырашае прыняць ванну, то ідзе на карнавал, што кожны раз суправаджаецца шэрагам жартаў і смешных сітуацый. Дарэчы, серыя фільмаў з Максам Ліндарам упершыню сфарміравала статус кіназоркі, і ганарар кінаакцёра стаў большым за ганарар тэатральнага артыста. Як пяціхвілінныя сюжэты, так і больш доўгія і насычаныя «становішчамі» карціны — «Макс і яго першая цыгара», «Макс і яго цешча», «Макс і хінная настойка» — зрабілі Ліндара сусветна вядомым.

Амерыканскае кіно хутка падхапіла гэты фармат і стала ў вялікай колькасці выпускаць на экраны створаныя амаль на «канвееры» камедыі становішчаў, поўныя пагоняў, падзенняў і кідання тортамі. З гэтага пачыналі і тры вялікія амерыканскія комікі — Чарльз Чаплін, Бастар Кітан і Гаральд Ллойд. Памятаеце, як гэтыя імёны адзін за адным з'явіліся ў тытрах савецкага мюзікла «Вясёлыя рабяты» з дабаўленнем выразу «... у фільме не здымаліся»? Савецкія жарты.

У гэтай школе сфарміраваўся найвядомейшы кінаобраз — персанаж Шарло ў шырокіх штанах, кацялку, не па памеры вялікім абутку і з палачкай. Джэнтльмен з трушчоб, гуманіст з вуліцы, шукальнік прытулку на гэтым свеце.

Тора-сан нагадвае яго не знешне, а па характары персанажа і, канешне, па сацыяльным становішчы вандроўніка, валацугі. Дарэчы, серыял «Мужчыну жывецца цяжка» трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса як самы працяглы ў гісторыі кіно — ён здымаўся з 1969 да 1995 года, работа над ім была скончана, толькі калі памёр Кіёсі Ацумі, што выконваў галоўную ролю.

Фільмы рэтраспектывы, арганізаванай Цэнтрам візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн», Японскім фондам, пасольствам Японіі ў Беларусі і кампаніяй «JTI», будуць паказваць ў кінатэатры «Перамога».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■

■ Нагода

# Якія тэатры самыя папулярныя?

**Заўтра, 27 сакавіка, адзначаецца інтэрнацыянальнае свята — Сусветны дзень тэатра, «тэатра як сродка ўзаемапаразумення і ўмацавання міру паміж народамі». Таму своечасова будзе нагадаць, што па колькасці праведзеных мерапрыемстваў у разліку на адзін тэатр і па колькасці іх наведванняў мы сярод краін СНД займаем лідзіруючыя пазіцыі. У 2015 годзе, паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, беларускія тэатры правялі амаль дзевяць тысяч спектакляў, канцэртаў і творчых сустрэч.**

Мяркуючы па статыстыцы канца мінулага года, у краіне працуе 28 прафесійных тэатраў, адзін з якіх — оперы і балета, восем — дзіцячых і юнага гледача і дзевятнаццаць драматычных і музычных. Іх рэпертуар у 2015 годзе склаў 1011 пастановак, 123 з якіх — новыя, а 342 створаны па творах беларускіх аўтараў. Дарэчы, доля дзіцячых спектакляў у агульнай колькасці дасягае 42,1%, што значыць 426 пастановак.

Каля 1,8 мільёна гледачоў наведалі тэатры ў 2015 годзе, амаль палову з іх прыцягнулі да сябе сталічныя сцэны. На першым месцы знаходзіцца Вялікі тэатр оперы і балета — яго пастаноўкі за год паглядзелі амаль 245 тысяч чалавек.

Другую пазіцыю, з прыкладнай лічбай 144 тысячы гледачоў, займае Дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр у Мінску. Акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску наведалі больш за 88 тысяч, ён на трэцім месцы.

На чацвёртым месцы замацаваўся Тэатр драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску, яго папулярнасць вымяраецца больш чым 84 тысячамі наведвальнікаў у год. 81 тысяча чалавек за мінулы год паглядзелі спектаклі Акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага ў Мінску, які закрывае пяцёрку самых любімых беларускімі гледачамі сцэн.

Сусветны дзень тэатра — гэта і падстава абмяркаваць праблемныя пытанні — інтарэс да тэатральнага мастацтва з боку гледача, фінансаванне, якасць пастановак, супраца з беларускімі драматургамі, уліванне ў працэс маладых аўтараў, суісnаванне акадэмічнасці і пэўнага канцэптуалізма, супраца з замежнымі калегамі.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 250/С-8750 1973 года постройки, общей площадью 353,9 кв.м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Суворова, 64, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж стоимостью 923 800 000 рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО «Полоцкая строительная компания»<br>(г. Полоцк, ул. Суворова, 64) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, г. Полоцк, ул. Суворова, 64 |
| **Наличие обременений** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения<br>Полоцкого района и г. Полоцка<br>г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 12<br>06 апреля 2016 года в 15.00 |
| **Справочная информация** | Справочная информация об организации торгов:<br>ГУЮ Витоблисполкома<br>210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 18,<br>www.vitebskjust.gov.by.<br>Судебный исполнитель Пашкевич Майя Владимировна,<br>тел.(80214)44 20 52 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка: ф-л 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 648, р/с 3642903000517, УНН 300002505 **не позднее 05.04.2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |